УДК 930.1: 7.036(476)

# БЕЛАРУСКАЯ КУЛЬТУРА КАНЦА XVIII - ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX СТСТ. У АСВЯТЛЕННІ АБАГУЛЬНЯЮЧЫХ ПРАЦ ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

*канд. гіст. наеукВ.У. ГАЛУБОВІЧ*
*(Полацкі дзяржаўны універсітэт)*

*Разгледжана гісторыя беларускай культуры канца XVIII - першай паловы XIX стст. у абагульняючых працах па гісторыі Беларусі. Вывучаецца спецыфіка стаўлення да праблем культуры на ўсіх этапах станаўлення беларускай гістарычнай навукі.*

Даследаванне гісторыі айчыннай культуры перыяду ўключэння Беларусі ў склад Расійскай імперыі мае свае традыцыі, моманты ўздыму і заняпаду. Вядома, што з'явы культуры адзначанага часу вывучаліся і вывучаюцца літаратура- і мастацтвазнаўцамі, гісторыкамі архітэктуры і адукацыі, грамадскай думкі і філасофіі. Аднак комплексна яны асэнсоўваюцца і даюцца шырокай чытацкай аўдыторыі толькі ў абагульняючых працах па гісторыі Беларусі. Менавіта на прыкладзе сітэзных даследаванняў можна прасачыць змены і тэндэнцыі развіцця гістарычнай навукі і выявіць стаўленне афіцыйнай гістарыяграфіі да ролі культуры ў грамадстве ў цэлым. Скразныя агляды беларускай гісторыі маюць неверагодную каштоўнасць для вывучэння гістарыяграфічных праблем, паколькі тут абагульняюцца, канешне ж, у большай ці меншай меры дасягненні як «вузкіх» спецыялістаў, так і цэлых галін гуманітарных ведаў. Вельмі істотна і тое, што адзнака з'яў культуры ў сінтэзах адбываецца ў адпаведнасці з агульнымі палітычнымі пазіцыямі аўтараў.

Дадзены нарыс прысвечаны вывучэнню таго, як гісторыя беларускай культуры першай паловы XIX ст. асвятлялася ў абагульняючых працах па гісторыі Беларусі.

**Абагульняючыя даследаванні дасавецкага часу.** Спробы стварэння абагульняючых прац па гісторыі Беларусі адносяцца да сярэдзіны XIX ст., але тагачасны ўзровень гістарычнага мыслення абумовіў адсутнасць цікавасці да праблем культуры. Так, у піянерскім «Аглядзе гісторыі Беларусі са старажытных часоў» В. Турчыновіча падзеі XIX ст. не разглядаюцца, як і культурны працэс увогуле [1].

Значным дасягненнем гістарыяграфіі другой паловы XIX ст. стала публікацыя ў 1882 г. трэцяга тома «Жнвопнсной Росснн», дзе побач з гістарычнымі, этнаграфічнымі і эканамічнымі ёсць раздзелы, адведзеныя развіццю культуры на Беларусі. Гісторыі і стану беларускай культуры ў томе былі прысвечаны два нарыса, аўтарам якіх з'яўляўся знаўца прадмету, гісторык і выдавец Адам Кіркор [2]. БольШая частка першага нарыса А. Кіркора «Асветніцтва і народная творчасць у Літве» [2, с. 97 - 136] прысвечана развіццю культуры на літоўскіх і заходнебеларускіх землях менавіта ў канцы XVIII - першай палове XIX стст. Аўтар ахарактарызаваў сістэму адукацыі (у першую чаргу Віленскі універсітэт) у краі і асоб, якія ўзначальвалі асветную працу. Шмат месца адведзена ў нарысе агляду жыццёвага і творчага шляху вядомых пісьменнікаў: Міцкевіча, Ю. Крашэўскага, У. Сыракомлі, а таксама гісторыкаў І. Лелявеля, І. Даніловіча, Т. Нарбута і інш. Не абмінае А. Кіркор і культурна-асветніцкай дзейнасці філаматаў і філарэтаў, якую ён не быў схільны разглядаць у палітычным кантэксце [2, с. 121]. Да важкіх элементаў культурнага жыцця краю даследчык адносіць музейную справу [2, с. 123 - 124], перыядычны друк [2, с. 133 - 135], тэатр [2, с. 135]. У дамінацыі польскай культуры на Беларусі А. Кіркор не бачыць нічога адмоўнага, тым больш што яе «апосталамі» былі ў вялікай ступені выхадцы з Беларусі. Панаванне польскай культуры тлумачыцца заканамерным уплывам больш моцнай цывілізацыі на слабейшую [2, с. 136]. Стану культуры на ўласна «беларускіх» (у тагачасным разуменні) землях А. Кіркор прысвяціў нарыс «Разумовыя сілы і сродкі адукацыі» [2, с. 317 - 328]. Большая яго частка аддадзена асветніцкай дзейнасці езуітаў. Сярод дзеячаў беларускай культуры аўтар асабліва адзначае В. Дуніна-Марцінкевіча, А. Вярыгу-Дарэўскага, Я. Баршчэўскага. Згадвае пра малавядомы літаратурны часопіс «Рубон». Дастаткова лаканічна, але з двух бакоў - польскага і расійскага, асвятляецца працэс гістарычнага вывучэння Беларусі.

Па ўзроўні асвятлення асобных аспектаў развіцця культуры на Беларусі ў вывучаемы перыяд А. Кіркору саступаюць многія абагульняючыя працы, створаныя ў XX ст. Далёка не ўсе пазнейшыя даследаванні ўтрымліваюць такую спецыфічную фактуру і маюць такую свабоду адзнакі з'яў. Сведчаннем запатрабаванасці кіркораўскага бачання на культуру, з пункту гледжання мясцовага беларускага патрыятызму, стала перавыданне тома на пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя.

У першай, напісанай па-беларуску, абагульняючай гісторыі Беларусі В. Ластоўскага «Кароткай гісторыі Беларусі», XIX ст. адведзена літаральна некалькі старонак у межах пятай часткі «Беларусь пад Расеей» [3]. Гісторыя культуры ўвогуле асвятляецца ў кнізе мелькам, што было абумоўлена агульнай аўтарскай канцэпцыяй - напісаць не гісторыю Беларусі, а гісторыю беларускага народа. У сваім кароткім нарысе В. Ластоўскі здолеў высветліць спецыфіку ўрадавай палітыкі на Беларусі ў цэлым і ў галіне

культуры паасобку [3, с. 94 - 95]. На апошніх старонках [3, с. 98 - 103] кнігі В. Ластоўскі паспрабаваў даць абагульнены агляд таго, «як развівалася культура ў нашым народзе» [3, с. 98]. Гісторык бачыў прычыны затрымкі развіцця нацыянальнай культуры ў першай палове XIX ст. як у «цяжкіх варунках, у якіх жыў край», так і ў тым, што «усе жывыя сілы краю былі захвачэны змаганнем за інтарэсы то польскай, то расейскай нацыі» [3, с. 100]. Агляд беларускай культуры быў зведзены да пераліку дзеячаў, якія праявілі сябе пераважна ў галіне літаратуры. Між іншых найболей ушаноўваецца В. Дунін-Марцінкевіч, якога аўтар называе «бацькам новага беларускага пісьменства» [3, с. 101]. Для першага сістэматычнага выкладу гісторыі Беларусі дадзеная інфармацыя выглядае прыймальнай.

Такім чынам, ужо першыя абагульняючыя працы па гісторыі Беларусі вызначылі важкасць дасягненняў беларускай культуры ў канцы XVIII - першай палове XIX стст.

Адзнака гісторыі айчыннай культуры канца **XVIII** - першай паловы **XIX** стст. беларускімі гісторыкамі ў міжваенны перыяд. Беларуская гістарыяграфія міжваеннага перыяду імкнулася развіваць традыцыі, закладзеныя ў царскія часы М. Доўнар-Запольскім і В. Ластоўскім. Побач са з'яўленнем чарговых абагульняючых прац былі падрыхтаваныя і шматлікія манаграфічныя даследаванні, выдадзены зборнікі дакументаў.

Знакавай постаццю беларускай гістарычнай навукі 20-х гадоў XX ст. з'яўляецца У. Ігнатоўскі. Гэтаму гісторыку належыць першае падсавецкае выданне айчыннай гісторыі - «Кароткі нарыс гісторыі Беларусі» [4]. На жаль, падзеі XIX ст. у нарысе асветлены вельмі фрагментарна, а культурныя працэсы засталіся ўвогуле неразгледжаныя. У пэўнай ступені прабелы сінтэзы былі запоўнены пасля выхаду кнігі У. Ігнатоўскага «Гісторыі Беларусі ў XIX і ў пачатку XX сталецця» [5]. У дадзенай працы, перавыданне якой пайшло б на карысць беларускай навукі, няма спецыяльнага раздзелу, прысвечанага культуры. Тое, што можна, часам з нацяжкай, звязаць з культурай, было размеркавана ў кнізе ў двух раздзелах: «Асвета на Беларусі» [5, с. 30 - 38] і «Беларускі рух у першай палавіне XIX сталецця» [5, с. 84 - 92].

У раздзеле, прысвечаным асвеце на Беларусі, аўтар засяроджвае ўвагу на гісторыі Віленскай вучэбнай акругі, яе кіраўніцтве і палітычных поглядах А. Чартарыйскага і Г. Калантая. Пра апошніх У. Ігнатоўскі адзначае, што «дзякуючы педагагічнай працы гэтых дзеячоў ідзе выхаванне моладзі на Беларусі ў польскім патрыятычным кірунку» [5, с. 31]. Падводзячы вынік разважанняў пра дзейнасць патаемных таварыстваў, аўтар адзначае, што са студэнцкіх гурткоў цікавасць да Беларусі пераходзіць у навуковыя, прафесарскія колы Віленскага універсітэта. Ён вылучае шэраг навукоўцаў, працы якіх былі звязаны з Беларуссю [5, с. 37].

Культуры быў прысвечаны раздзел з не вельмі характэрнай для яго зместу назвай «Беларускі рух у першай палавіне XIX сталецця». Цэласнай характарыстыкі культуры, аднак, тут шукаць не варта. Адзнака становішча беларускай культуры вызначаецца фразай: «Росквіт беларускай культуры падае на XVI і XVII сталецці» [5, с. 84]. Праца гісторыка была запраграмавана на пошук беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці («к канцу XVIII сталецця беларусам застаецца толькі селянін і чорнарабочы»), адсюль стрыманасць ў адносінах таго, што нельга было адназначна назваць беларускім. Характарыстыка беларускай культуры адзначанага часу даецца ў У. Ігнатоўскага ў кантэксце працэсаў паланізацыі - русіфікацыі і мае выразнае сацыяльна-класавае адценне. Так, падагульняючы характарыстыку творчасці Паўлюка Багрыма (у арыгінале - Бахрыма), гісторык адзначыў: «Дзверы да тагачаснага беларускага нацыянальна-культурнага руху былі яшчэ зачынены для запрыгоненага простага селяніна» [5, с. 92]. Па сутнасці, наследуючы У. Ігнатоўскаму, пазнейшыя савецкія гісторыкі разглядалі культуру Беларусі як выключна нацыянальную з'яву, пакідаючы па-за аглядам стракатую шматэтнічную палітру культурных дачыненняў эпохі.

Больш грунтоўнай, у параўнанні з працамі У. Ігнатоўскага, выглядае створаная да сярэдзіны 20-х гадоў XX ст. «Гісторыя Беларусі» Мітрафана Доўнара-Запольскага [6]. У першую чаргу не выпадае не адзначыць, што сама структура кнігі і адпаведных раздзелаў, прысвечаных культуры першай паловы XIX ст., сведчыць аб акадэмічным мысленні аўтара [6, с. 509]. Культура Беларусі вывучаемага перыяду разглядаецца М. Доўнарам-Запольскім у межах дзвюх глаў: XIV «Культура і асвета ў перыяд дзейнасці Віленскага універсітэта» [6, с. 253 - 266] і XVII «Беларуская народнасць і яе культура да эпохі нацыянальнага адраджэння» [6, с. 341 - 366]. У суме дадзенай праблеме прысвечана 38 старонак, што цяжка параўнаць з аналагічнымі раздзеламі большасці савецкіх сінтэз другой паловы XX ст. У вялікай ступені аўтарская інтэрпрэтацыя і падача матэрыялу з'яўляецца адпаведнай, а ў нечым і пераўзыходзіць узровень сучаснай гістарычнай навукі на Беларусі.

Глава, прысвечаная культуры ў эпоху Віленскага універсітэта, насычана аб'ектыўнымі адзнакамі прапольскай дзейнасці кіраўніцтва навучальнай акругі. Усведамляючы вынікі адукацыйнай палітыкі, аўтар у перафраз В. Ластоўскаму адзначыў: «Гэта эпоха вырвала з Беларусі шмат яе выдатных сыноў, якія забыліся пра сваю нацыянальнасць пад уплывам агульнага ўздыму паланізацыі і аддалі свой розум і здольнасці польскай культуры і нацыянальнасці» [6, с. 263]. Бадай адзіны сур'ёзны сюжэт, што не быў

разгледжаны М. Доўнарам-Запольскім, - гэта высвятленне ролі Віленскага універсітэта як асяродка вывучэння беларускай гісторыі.

Другая глава даследавання М. Доўнара-Запольскага, прысвечаная культуры XIX ст., мае свае адметнасці. Ва ўводным пункце дастаткова нечакана для беларускай гістарыяграфіі адзначаецца, што пашырэнне польскага ўплыву на Беларусі было вынікам «няўдалай палітыкі рускага ўрада, які сваімі мерамі падтрымаў паланізацыю» [6, с. 341], а «руская палітыка зусім адхілілася ад падтрымкі беларускай нацыянальнасці, не ведала яе і не разумела» [6, с. 342]. Сваю каштоўнасць мае тэзіс аб прычынах прывабнасці польскай нацыянальнай ідэі на Беларусі, што М. Доўнар-Запольскі тлумачыў высокім узроўнем польскай культуры і яе ліберальнасцю [6, с. 342]. У пункце «Адток беларускіх культурных сіл» асноўны акцэнт быў звернуты вучоным на высвятленне беларускіх элементаў у творчасці А. Міцкевіча і У. Сыракомлі. Трэці пункт главы даследчык прысвяціў адносінам расійскай культуры і грамадства да Беларусі. Дух разважанняў гісторыка добра ілюструецца адным сказам: «беларуская нацыянальнасць мала выйграла ад прызнання яе роднасці з велікарусамі» [6, с. 348]. Трэці, чацверты і пяты пункты раздзелу працы М. Доўнар-Запольскага складаюць грунтоўны нарыс пачаткаў навуковага вывучэння гісторыі, этнаграфіі і мовы Беларусі, зараджэння беларускай літаратуры і асобна- пра дзейнасць В. Дуніна-Марцінкевіча.

Нарэшце трэба прыгадаць, што ў 40-я гады два разы друкавалася папулярная несавецкая праца Я. Найдзюка «Беларусь учора і сяньня», дзе аўтар не абмінуў і культурнае жыццё беларускага народа ў першай палове XIX ст. [7]. Адзнака працэсаў паланізацыі і русіфікацыі, беларусазнаўства і станаўлення нацыянальнай літаратуры ў кнізе дадзена з пункту гледжання блізкага М. Доўнару-Запольскаму і У. Ігнатоўскаму.

Калі падагульніць вынікі даследаванняў беларускай культуры ў абагульняючых працах У. Ігнатоўскага і М. Доўнар-Запольскага, можна заўважыць, што для іх вызначальным з'яўляецца разгляд культурных падзей у кантэксце палітыкі расійскага ўраду на Беларусі. Менавіта антыруская скіраванасць прац беларускіх гісторыкаў стала прычынай доўгага забыцця іх прац. Для прац У. Ігнатоўскага і М. Доўнар-Запольскага ўласцівы і некаторыя тэмы, якія пазней не вылучаліся ці пісаліся інакш. Так, абодва гісторыкі шмат увагі надавалі дзейнасці Віленскай навучальнай акругі і універсітэта. Разам з тым абыходзіліся пытанні архітэктуры і мастацтва.

Абагульняючыя працы 50 - 80-х гадоў XX ст. Як адзначыў вядомы нямецкі гісторык Р. Ліндпэр: «Жаданню мець звязны выклад гісторыі БССР «ад найстаражытнейшых часоў да нашых дзён» было гэтулькі сама гадоў, колькі самой БССР» [8]. У пасляваенны перыяд існавання БССР, як вядома, з'явіўся цэлы шэраг сінтэзных даследаванняў гісторыі Беларусі. Усе яны маюць розную якасць і фактычнае напаўненне. У адносінах нашай тэмы ў пасляваенных гісторыях Беларусі таксама няма адзінства, адзнакі вагаюцца і змяняюцца ў залежнасці ад палітычнай кан'юнктуры. Аднак у цэлым ў працэсе вывучэння гісторыі ў пасляваенны перыяд назіраецца эвалюцыя ад усеагульнага адмаўлення неактуальных для марксісцкай гістарыяграфіі сюжэтаў да дапушчэння ідэалагічна нейтральных тэм.

Першай сінтэзай айчыннай гісторыі паваеннага часу была афіцыйная акадэмічная «Гісторыя Беларускай ССР» (1954 г.), першы том якой даведзены да 1917 г. і ўтрымлівае цікавыя для нас тэксгавыя часткі [9]. У межах адзінаццатай главы выдання вылучаны пункт «Культура Беларусі ў першай палове XIX ст.» [9, с. 252 - 257]. Нават па аб'ёме - гэта значны рэгрэс у параўнанні з даваеннай эпохай.

Праграмны тэзіс «Уз'яднанне Беларусі з Расіяй стварыла спрыяльныя ўмовы для развіцця культуры беларускага народа і вывела яе з таго глыбокага заняпаду, у якім яна знаходзілася пад уладай шляхецкай Полыпчы», якім пачынаецца пункт, прысвечаны культуры, не мае нічога супольнага як з рэчаіснасцю, так і высновамі пачынальнікаў беларускай гістарыяграфіі. Гэтае глыбокадумнае адкрыццё аўтары пацвярджаюць спасылкай на пісьменніка Якуба Коласа. Паколькі ж Беларусь у першай палове XIX ст. пад уладай расійскіх імператараў асаблівымі дасягненнямі ў галіне адраджэння нацыянальнай культуры паганарыцца не магла, то ў томе тлумачылася, што прычынай гэтага выступаў феадальна-прыгонніцкі лад, які нібы тармазіў развіццё культуры ўсіх народаў Расіі. Гэта асабліва кашчунская выснова, паколькі нельга параўноўваць стан дзяржаўнай расійскай культуры і культуры іншых народаў імперыі.

Агляд культуры пачынаецца са стану асветы, але аналіз сітуацыі падмяняецца падгонкай фактаў па зараней вызначанай схеме. Так, што да сапраўднай ролі Віленскага універсітэта, то ў «Гісторыі БССР» гэтага выдання яна застаецца не высветленай, а закрыццё навучальнай установы разглядаецца як справа станоўчая, бо універсітэт быў *злачынным* «рассаднікам польска-каталіцкага ўплыву ў Беларусі» [9, с. 253]. Адчуваецца і задаволенасць аўтараў ад прыведзенага факта выгнання ў 1820 г. «агентаў Ватыкану - езуітаў» у сувязі з закрыццём у Полацку вышэйшай ордэнскай навучальнай установы - акадэміі, якая ў кнізе памылкова названа калегіяй [9, с. 253]. Інтэпрэтацыя дасягненняў вуснай народнай творчасці даецца праз прызму класавай барацьбы сялянаў з прыгнётам. Побач з дэмакратычнай народнай літаратурай аўтары вылучаюць, згодна з патрабаваннямі эпохі, шляхецка-польскі накірунак у літаратуры Беларусі. Асаблівую незадаволенасць выклікае творчасць «ідэолага польска-шляхецкага ліберапізма» Я. Чачота і «зацятых рэакцыянераў і цемрашалаў» А. Рыпінскага і Я. Баршчэўскага, у якой адлюстра-

валіся «інтарэсы польскіх паноў» [9, с. 255 - 256]. Можна толькі пазайздросціць майстрам сталінскай гістарычнай школы ў іх вынаходніцтве абразлівых і недапасавальных эпітэтаў. Побач даецца адказ на пытанне, чаму Я. Чачот і іншыя сапраўды былі «рэакцыянерамі»: іх працы, нібы насычаны духам, варожым да Расіі [9, с. 256]. Разам з тым станоўчую адзнаку атрымаў у дадзеным выданні В. Дунін-Марцінкевіч. Адсутнічае ў дадзеным раздзеле аналіз развіцця архітэктуры і выяўленчага мастацтва. Характарыстыка беларускай культуры і гісторыі ў цэлым адбываецца па прымітыўнай схеме: адмоўнае ўсё, што з захаду і ад паноў, станоўчае ўсё, што з усходу і з народу.

Крыху зменены варыянт першай савецкай двухтамовай «Гісторыі БССР» быў надрукаваны ў 60-я гады мінулага стагоддзя, аднак ніякіх змен ацэнак культуры Беларусі першай паловы XIX ст. тут не было [10].

Дарэчы тут будзе нагадаць, што беларускія эмігранцкія навукоўцы спрабавалі стварыць альтэрнатыўныя савецкім сінтэзы гісторыі Беларусі і давалі сваё бачанне стану культуры. Так, вядомы мовазнаўца і гісторык Я. Станкевіч у апублікаваным на старонках часопіса «Веда» ў 1951 г. «Кароткім нарыце гісторыі Крывіч-Беларусі» абгрунтоўваў тэзіс пра паніжэнне культурнага ўзроўню на Беларусі ў першай палове XIX ст. у выніку мерапрыемстваў па закрыцці вышэйшых навучальных устаноў [11].

У 1972 г. свет пабачыў першы з пяці тамоў абагульняючай гісторыі Беларусі, самай вялікай і да сённяшняга дня [12]. З часу з’яўлення першага паваеннага варыянту беларускай гісторыі прайшло 18 год, і трэцяя па ліку сінтэзная праца цалкам адлюстравала змены, якія адбыліся ў гістарычнай навуцы. Дадзенае выданне, па крайняй меры першы яго том, не гледзячы на ўсе хібы і даніну палітычнай ідэалогіі савецкай дзяржавы, стала заўважным крокам наперад беларускай савецкай гістарыяграфіі. Адаым з мацнейшых бакоў кнігі трэба прызнаць добрае фактычнае напаўненне і шырокае выкарыстанне архіўных матэрыялаў, а таксама адмова ад неабгрунтаванай і абсурднай крытыкі аб’ектыўна станоўчых з’яў мінулага. Разам з тым ваяўнічы антыклерыкалізм і крытыка ў святле барацьбы класаў з’яўляюцца неад’емнымі элементамі аўтарскага аналізу. Усё гэта можна цалкам аднесці і да XXI раздзелу «Культура ў першай палове XIX ст.». Раздзел пераўвышае па колькасці старонак [12, с. 507 - 559] і разнастайнасці асветленых аспектаў усе папярэднія і наступныя выданні. У межах XXI раздзела вылучаны як традыцыйныя пункты «Асвета» [12, с. 507 - 519], «Літаратура» [12, с. 519 - 530], так і новыя ў адносінах да гэтага прамежку часу «Грамадская думка» [12, с. 530 - 540], «Быт і народная творчасць» [12, с. 540 - 548], «Архітэктура і выяўленчае мастацтва» [12, с. 548 - 555], «Музыка і тэатр» [12, с. 555 - 559].

Пункт, адведзены аўтарамі стану асветы, напісаны на багатым фактычным матэрыяле і па сутнасці цалкам прысвечаны развіццю школьнай справы на ўласна беларускіх землях. Інфармацыя пра Віленскі універсітэт - галоўны асяродак навукі ў рэгіёне - прыводзіцца ў двух абзацах і толькі ў сувязі з яго закрыццём [12, с. 514 - 515] і як бы знаходзіцца ў цэню архіўных звестак пра школы. Структура універсітэта, дзейнасць факультэтаў і ўзровень выкладання, ці не самае патрэбная для асэнсавання тагачаснага ўзроўня вышэйшых навучальных устаноў свядома пакідаецца па-за даследаваннем. З перспектывы сённяшняга дня двухсэнсоўнае адценне мае фраза: «старэйшы ў *нашай краіне* Віленскі універсітэт на працягу трох дзесяцігоддзяў XIX ст. быў для Беларусі адзінай вышэйшай навучальнай установай» [12, с. 514]. З аднаго боку, не выпадае сумнявацца, што *наша краіна* - гэта былы Савецкі Саюз, на тэрыторыі якога Віленскі універсітэт сапраўды быў самай першай навучальнай установай, а з другога - аўтар проста не згадвае пра існаванне Полацкай езуіцкай акадэміі.

У пункце, прысвечаным развіццю літаратуры, ускосна развенчваецца манаполія расійскага рэвалюцыйнага дваранства на права інспіраваць культурны працэс на Беларусі [12, с. 519], хаця аўтарскія прыярытэты ад гэтага ў цэлым не пакутуюць. Тут жа адбываецца сімвалічная рэабілітацыя некаторых асоб. Так, Я. Баршчэўскі ператвараецца з «рэакцыянера» ў «заўзятага збіральніка беларускай вуснапаэтычнай творчасці» [12, с. 525]. Толькі як дзеячы польскай культуры згадваецца А. Міцкевіч, У. Сыракомля, толькі як рэакцыйны езуіцкі часопіс - «Полацкі месячнік».

Новыя пазіцыі ў асвятленні культуры не выклікаюць асаблівых заўваг, паколькі па насычанасці інфармацыяй іх няма з чым параўнаць (тут не ўлічваюцца манаграфіі). Аўтарамі прапаноўваецца шырокай аўдыторыі азнаёміцца з грамадскай і філасофскай думкай эпохі, аналізуюцца ўмовы жыцця, мастацтва, густы, звычаі, святы беларусаў, здабыткі архітэктуры, жывапісу, тэатру.

Пяцітомнае выданне «Гісторыі БССР» стала лепшым і апошнім дасягненнем беларускай савецкай гістарыяграфіі. Але адначасова гэта кніга набыла ў пэўнай ступені кананічны характар і стала адзінай крыніцай адфільтраваных ведаў. Гістарычная навука БССР напрацягу 70-х і 80-х гадоў за каменным мурам пяцітомніка канчаткова закасцянела. Наступная сінтэза гісторыі Беларусі - аднатомная «Гісторыя БССР» (1977 г.) не ўяўляе ніякай каштоўнасці ў гістарыяграфічным сэнсе [13]. Пункт, прысвечаны культуры Беларусі першай паловы XIX ст. [13, с. 110 - 115], уяўляе сабой вельмі скарочаны паўтор адпаведнага раздзела пяцітомніка.

Напрыканцы 70-х гадоў свет пабачыла і адзіная да нядаўняга часу абагульняючая праца па гісторыі Беларусі на польскай мове. Аўтарам гэтай выдадзенай ва Уроцлаве гісторыі быў вядомы поль-

скі даследчык Марцэлі Косман [14]. Інфармацыя пра культуру раскідана аўтарам па некалькіх пунктах восьмага раздзелу кнігі «У расійскай дзяржаве». Абмежаваны па аб'ёму пункт «Нацыянальныя і культурныя адносіны» [14, с. 205 - 206] уяўляе собой кароткі агляд развіцця школьніцтва, друкарскай справы, тэндэнцый развіцця пісьменнасці, навукі. Польскі гісторык звяртае ўвагу і на новы асяродак культуры на Беларусі - Шчорсы пад Наваградкам, дзе Храптовічы сабралі і зрабілі агульна дасягальнай бібліятэку ў 15 000 тамоў [14, с. 206]. Другі пункт, дзе ідзе гаворка пра інтэлектуальнае жыццё [14, с. 216 - 217], складаецца з агляду творчасці А. Міцкевіча, Т. Зана, Я. Чачота, 3. Даленгі-Хадакоўскага. Важнейшы аспект культурнага працэсу на Беларусі гэтага часу, на думку М. Космана, - гэта развіццё літаратуры, апавяданне пра якую займае пункт «Беларуская літаратура. Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч» [14, с. 216 - 220]. Параўноўваючы беларускія і польскую інтэрпрэтацыі, можна заўважыць большую свабоду ў ацэнках менавіта польскага гісторыка. У задачу аўтара не ўваходзіў доказ прагрэсіўнасці ўплыву на беларускую культуру расійскай, таму літаратурны працэс паказваецца як вынік росту цікавасці мясцовай польскамоўнай інтэлігенцыі да культуры простага народу.

80-я гады XX ст. не былі плённым перыядам у справе стварэння абагульняючых даследаванняў па беларускай гісторыі. Лагічным заканчэннем працы гісторыкаў у 70-я гады па стварэнні сінтэзнай гісторыі БССР стала з'яўленне падручніка для вышэйшай школы, падрыхтаванага калектывам аўтараў з БДУ і Мінскага педагагічнага інстытута [15]. Параграф шосты «Культура» [15, с. 192 - 195] з сёмай главы кнігі мае не ацэначны, а пераважна даведачны характар: дадзена лаканічна інфармацыя пра адукацыю, літаратуру, мастацтва, архітэктуру і тэатр на Беларусі ў першай палове XIX ст. У цэлым арыгінальнасцю інтэрпрэтацыі падручнік не вылучаецца.

Такім чынам, асвятленне культуры Беларусі канца XVIII - першай паловы XIX стст. у сінтэзных гісторыях БССР у 50 - 80-х гадах XX ст. мела ў цэлым станоўчую тэндэнцыю. ГІараўнанне першай (1954 г.) і апошняй (1972 г.) татальных версій гісторыі БССР сведчыць: па-першае, пра адмову ад вульгарнамарксісцкага падыходу да з'яў культуры, па-другое, пра павелічэнне аспектаў культуры, якія разглядаюцца ў абагульняючых працах.

Абагульняючыя працы 90-х гадоў XX ст. - пачатку XXI ст. Беларуская гістарыяграфія ў 90-х гадах XX ст., 'магчыма як ніякая іншая навука, перажыла перыяд сапраўднага адраджэння. Значна пашырыўся дыяпазон даследаванняў, іх метадалагічная аснова і, што не менш істотна, узрасла колькасць публікацый. 3 сярэдзіны 90-х гадоў XX ст. сталі больш рэгулярна выходзіць і перавыдавацца абагульняючыя працы па гісторыі Беларусі.

Да гэтага часу адной з лепшых спробаў стварыць нацыянацьную інтэрпрэтацыю гісторыі Беларусі ў незапежнай Рэспубліцы Беларусь трэба прызнаць падрыхтаваныя супрацоўнікамі Інстытута гісторыі Нацыянальнай Акадэміі Навук Беларусі «Нарысы гісторыі Беларусі» ў 2-х частках [16]. У першай частцы «Нарысаў», прысвечанай гісторыі Беларусі ад пачаткаў да 1917 г., у пятым раздзеле «Крызіс феадальнапрыгонніцкай сістэмы (канец XVIII - першая палова XIX стст.)» быў вылучаны пункт «Культура», дзе аналізуюцца ўмовы і асноўныя накірункі развіцця культуры, працэсы паланізацыі і русіфікацыі, станаўленне беларусазнаўства і нацыянальнай літаратуры [16, с. 290 - 302]. Аўтарам тэкста з'яўляецца С. Кузняева. Самым важкім дасягненнем аўтара культурнай часткі раздзела, на наш погляд, з'яўляецца адыход ад пастулату беларускай савецкай гістарыяграфіі: ва ўсім шукаць адзінства з расійскай культурай, нават калі гэтага не было. Нарэшце быў напісаны тэкст, пазбаўлены бясконцых ідэалагічных шаблонаў і адпаведнай фразеалогіі, а з'явы культуры сталі разглядацца ў кантэксце не жаданых, а сапраўдных гістарычных умоў. Так, адным сказам быў вернуты ў гісторыю адукацыі Віленскі універсітэт. Рэалізацыя нацыянальнай канцэпцыі гісторыі Беларусі нарэшце расставіла прыярытэты ў ацэнцы культурных падзей і дазволіла аб'ектыўна падыйсці да асэнсавання ролі польскай і расійскай культуры і палітыкі на беларускіх землях у першай палове XIX ст. Беларусь была акрэслена як край, дзе суіснавалі роднасныя славянскія культуры, а іх высокі ўзровень быў узорам, на які арыентавалася маладая беларуская культура [16, с. 296]. С.А. Кузняева адзначае, што польскі і расійскі ўплыў на Беларусі адбываўся па двух напрамках, адзін з якіх быў звязаны з натуральным імкненнем народа да культурнага абмену, а другі - з паланізацыяй і русіфікацыяй беларускіх земляў [16, с. 296]. Цяжка не пагадзіцца і з апошняй высновай аўтара: «агульны накірунак развіцця культуры на беларускіх землях у бок нацыянальнай формы і зместу яскрава сведчыў аб пачатку працэсаў нацыянальнага адраджэння» [16, с. 302]. Большая частка зробленых у «Нарысах» высноў у той ці іншай форме перайшла ў шматлікія пазнейшыя версіі гісторыі Беларусі.

У кантэксце нацыянальнай канцэпцыі гісторыі Беларусі можна разглядаць і «Гісторыю Беларусі» пад рэдакцыяй Ю. Казакова, А. Каханоўскага, П. Лойкі і інш., першае выданне якой пабачыла свет у 1996 г. [17]. Наступныя передрукі гэтай кнігі на яе першапачатковы змест не паўплывалі [18]. Пра культурныя працэсы на Беларусі ў першыя паўстагоддзі знаходжання ў складзе Расійскай імперыі напісала для кнігі гродзенскі гісторык і вядомы спецыяліст у гэтай галіне С. Куль-Сяльвестрава. Схема, паводле якой размешчаны матэрыял у дапаможніку, не вылучаецца асаблівай навізной: агульныя ўмовы развіцця культуры, адукацыя, навукавае жыццё, літаратура, журналістыка, тэатр і музыка, выяўленчае

мастацтва. Побач з акадэмічнымі «Нарысамі» дапаможнік можна ахарактарызаваць як выданне, дзе прысутнічаюць элементы культуралагічнага аналізу, што не звязана з нейкай ідэалагічнай праграмай. Разам з тым ёсць і пэўная тэндэнцыя. Аўтарка падкрэслена імкнецца давесці заходнюю арыентаванасць беларускай культуры, якая «дасягнула еўрапейскіх вышынь» [18, с. 225]. Вельмі важкай у кантэксце таго, што будзе сказана ніжэй, выглядае наступная заўвага С. Куль-Сяльвестравай: «Царскі ўрад, не забараняючы афіцыйна беларускую мову, перакрываў ёй шлях да прыгожага пісьменства. Асабліва моцна пашкодзіла станаўленню новай беларускай мовы забарона друкаваць на лацінцы, выдадзеная ў сувязі з цэнзурным разглядам перакладу ' «Пана Тадэуша» В. Дуніна-Мрцінкевіча» [18, с. 226]. Каштоўным ілюстрацыйным матэрыялам да высноў аўтара трэба лічыць прыведзеныя пасля тэксту вытрымкі з дакументаў [18, с. 226 - 227]. Дадзеная «Гісторыя Беларусі», па сутнасці, з'явілася другім і апошнім выдавецкім праектам, створаным на належным навуковым узроўні на хвалі беларускага Адраджэння пачатку 90-х гадоў XX ст. Наступныя версіі гісторыі Беларусі, створаныя ў канцы XX - пачатку XXI стст., у пераважнай масе падрыхтаваныя з улікам іншай палітычнай кан'юнктуры, утрымліваюць толькі нейтральныя высновы вышэйпералічаных выданняў.

Гісторыя культуры Беларусі канца XVIII - першай трэці XIX стст. знайшла сваё адлюстраванне і ў першым томе «Гісторыі Беларусі» пад рэдакцыяй Я. Новіка і Г. Марцуля [19]. У кнізе вылучаецца асобны раздзел IV «Беларусь у складзе Расійскай імперыі. Крызіс феадальна-прыгонніцкай сістэмы (канец XVIII - першая палова XIX стст.)», які складаецца з дзвюх глаў, пры гэтым другая цалкам прысвечана культуры Беларусі канца XVIII - першай паловы XIX стст. Адметнасцю кнігі з'яўляецца спроба з'яднаць усе праблемы, акрамя культуры, вызначанага намі перыяду ў адным параграфе «Унутраная палітыка расійскага ўрада на Беларусі» [19, с. 263. - 280]. Дадзеная інтэрпрэтацыя айчыннай гісторыі стала з часам афіцыйна прызнанай, таму можна каротка спыніцца на яе характарыстыцы. Хаця фактаграфічнае напаўненне параграфаў можна лічыць задавальняючым, асабліва ў галіне тэатру, жывапісу, архітэктуры і скульптуры, агульная канцэпцыя главы мае выразныя хібы.

Не ў апошнюю чаргу выклікае здзіўленне і пярэчанне тое, што вучэбнае выданне становіцца полем для палемічных выпадаў аўтараў кнігі. Так, першы параграф главы «Культура Беларусі канца XVIII - першай паловы XIX стст.», замест заяўленага паказу асаблівасцяў культурнага развіцця, амаль напалову заняты апалагетыкай «гістарычнай праўды» і расійскага імператара Мікалая I, якія нібы сталі ахвярай недабразычлівасці і неахайнасці беларускіх гісторыкаў яшчэ з міжваеннага часу [19, с. 285]. У параграфе на трох старонках прыведзена аж 7 доказаў таго, што тэрміны «Беларусь» і «Літва» не былі забаронены, а, наадварот, шырока выкарыстоўваліся. На жаль, у кнізе не агаворваецца той простай ісціны, што забарона называць Віленскую і Гродзенскую губерні літоўскімі, а Віцебскую і Магілёўскую - беларускімі адмоўна адбілася на захаванні гістарычнай спецыфікі краю, але, здаецца, гэта аўтары зразумець не жадалі. На гэтым, аднак, недарэчнасці не спыняюцца. Так, на 288 старонцы сцвярджаецца, што «гістарычнай навуцы невядомы царскія ўказы ці ўрадавае распараджэнне аб забароне беларускай мовы і беларускага друкаванага слова», а ніжэй сцвярджаецца цалкам адваротнае «у сувязі з цяжкасцямі друкавання і распаўсюджвання беларускіх твораў, а таксама забаронай у канцы 50-х гадоў друкавання ўкраінскіх і беларускіх кніг лацінскім шрыфтам літаратура была пераважна рукапіснай» [19, с. 294]. Нарэшце, невядома па якіх прычынах, выявы дзеячаў культуры і навукі Беларусі першай паловы XIX ст. трапілі за межы главы, прысвечанай культуры.

Для шэрагу абагульняючых прац па гісторыі Беларусі, створаных у 90-х гадах XX ст., з'яўляецца характэрнай спроба сумяшчэння ацэнак, выпрацаваных у беларускай савецкай гістарыяграфіі, з павелічэннем аб'ёму тых ці іншых раздзелаў за кошт новых фактаў. Характэрным у гэтым сэнсе з'яўляецца праца гарадзенскіх гісторыкаў I. Коўкеля і Э. Ярмусіка «Гісторыя Беларусі», якая пабачыла свет у 1998 г. [20]. Аўтары прымаюць на ўзбраенне савецкую методыку напісання нацыянальнай гісторыі. Нацыянальная гісторыя ствараецца пры такім падыходзе толькі як рэгіянальнае тлумачэнне агульнай гісторыі Расіі. У кнізе I. Коўкеля і Э. Ярмусіка асобна вылучаюцца пункты, прысвечаныя грамадска-палітычнаму і культурнаму развіццю Беларусі ў першай палове XIX ст. Аўтары справядліва вылучаюць час да лістападаўскага паўстання на Беларусі як адметны перыяд у развіцці градамадска-палітычнага руху і культуры. Не гледзячы на адносна нейтральны характар зместа, шэраг тэзісаў кнігі выклікае пярэчанне. Так, напрыклад, уплыў польскай і ў меншай ступені рускай культуры на Беларусі ў першай палове XIX ст. досыць наіўна тлумачыцца між іншым тым, што Беларусь знаходзілася доўгі час у складзе Рэчы Паспалітай і непрацяглы час у складзе Расійскай імперыі [20, с. 116].

Навінкай 2000 г. стаў чарговы дапаможнік па курсу гісторыі Беларусі для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў, падрыхтаваны П. Чыгрынавым [21]. Дадзеная кніга адметна тым, што аўтар культурны працэс у першай палове XIX ст. разглядае ў параграфе «Сацыяльна-эканамічная і культурная папітыка» [21, с. 215 - 236]. Як фактычнае напаўненне, так і адзнакі накірункаў развіцця культуры Беларусі не выклікаюць заўваг. Да відавочных памылак можна аднесці толькі тое, што ў 1843 г. I. Даніловіч і

М. Абаленскі ўсё ж выдалі не кнігі «Польской метрнкн Велнкого Княжества Лнтовского», як адзначана ў П. Чыгрынава, а «Кннгн посольскне Метрнкн Велнкого Княжества Лнтовского» [22].

У 2001 г. у мінскім выдавецтве «Аверсерв» выходзіць другая, пасля кнігі У. Ігнатоўскага, гісторыя Беларусі, якая ахоплівае перыяд знаходжання ў складзе Расійскай імперыі [23]. Падрыхтавана кніга была калектывам гродзенскіх гісторыкаў і выйшла пад рэдакцыяй прафесара І. Крэня і дацэнта І. Коўкеля як дапаможнік для студэнтаў гістарычных спецыяльнасцей вышэйшых навучальных устаноў. Зразумела, што пытанні культуры ў дапаможніку не абмінаюцца, але для такога спецыялізаванага выдання, на наш погляд, адведзеных 20 старонак тэксту яўна недастаткова. Аўтарам раздзелу «Культура Беларусі ў першай палове XIX ст.» з'яўляецца дацэнт І. Коўкель. Нескладаны тэксталагічны аналіз дазваляе заўважыць, што многія сказы перашага пункта «Умовы развіцця культуры, асаблівасці гісторыка-культурнага працэсу» [23, с. 124 - 126] даслоўна адпавядаюць іншаму дапаможніку і іншаму аўтару [24]. Асноўны матэрыял главы размяркоўваецца наступным чынам: асвета, навука, вышэйшая школа [24, с. 126 - 132]; літаратурнае жыццё, перыядычны друк, бібліятэчная справа [24, с. 132 - 137]; музыка і тэатр [24, с. 137 - 142]; архітэктура і выўленчае мастацтва [24, с. 142 - 145]. Арыгінальнай фактуры аўтар у тэкст не ўкладаў, адсюль і стандартная для дапаможніка тэрміналогія і аналітыка.

2002 год адзначыўся выхадам з друку адразу дзвюх новых «Гісторый Беларусі», прысвечаных XIX і XX стст. Першая з іх уяўляе сабой працяг курса лекцый, які быў выдадзены ў 2000 г., але створана яна не гарадзенскімі, а мінскімі гісторыкамі [25]. Другая гісторыя з'яўляецца працягам польскага выдання кнігі Г. Сагановіча «Нарысы гісторыі Беларусі» і прысвечана падзеям 1795 - 2000 гг. Аўтарам яе з'яўляецца вядомы беларускі гісторык Захар Шыбека. Кніга на польскай мове выйшла ў Любліне [26].

Параўнанне двух выданняў дае падставы выказаць некалькі заўваг. Мінская гісторыя, напісаная калектывам аўтараў, спецыялістаў па розных праблемах, выглядае цалкам традыцыйнай працай як па фактычнаму напаўненню, так і па глыбіні інтэрпрэтацыі. Структура кнігі і назвы раздзелаў не выклікаюць жадання шукаць тут нечага новага. На нашу думку, найбольш яскравае адрозненне двух выданняў у тым, што курс лекцый па сутнасці сваёй разлічаны на запамінанне і валоданне матэрыялам, ён стрымана афіцыйны і неацэначны. Гісторыя З. Шыбекі, насупраць, разлічана не столькі на тое, каб чытач назапашваў веды, колькі на разуменне сутнасці гістарычных перэпетый. Пры гэтым аўтар імкнецца паказаць падзеі з пазіцый беларускіх нацыянальных інтарэсаў і гэтым самым адлюстроўвае свае ўласныя глыбока субьектыўныя нацыянальныя пачуцці.

Адрозніваецца арыгінальнасцю падыход З. Шыбекі да падзелу матэрыялу. Гісторык вылучае ў межах 1795 - 1863 гг. два перыяды і адпаведна два раздзела, першы з якіх храналагічна ахоплівае 1795 - 1830 гг. і акрэсліваецца як час польскай дамінацыі і літоўска-беларускага рэгіяналізму, а другі (1831 - 1863 гг.) вызначаецца як час польска-расійскага канфлікту. Манаграфічная праца З. Шыбекі выклікае інтарэс ужо з-за спецыфічнасці і неардынарнасці загалоўкаў. Так, пункт першага раздзела, між іншым прысвечаны таксама культуры, называецца «Паланізацыя ў імя расійскага цара», а падпункты - «Палітыка ўладаў», «Школьная рэформа на Беларусі», «Вынікі рэформаў». У межах другога раздзелу, прысвечанага 1831- 1863 гг., З. Шыбека вылучае пункт з характэрнай назвай «Праявы беларускасці», у межах якога выступаюць падпункты «Культурная прастора», «У крыніц самапазнання», «Беларускі кантынент», «Элітарная культура». Для параўнання, бездапаможна традыцыйная «Гісторыя Беларусі», выдадзеная калектывам аўтараў, культуру канца XVIII - першай паловы XIX стст. разглядае ў кананічным рэчышчы: развіццё асветы, навукі, літаратуры, музыкі, архітэктуры і жывапісу. Разам з тым фактычнае напаўненне абедзвюх гісторый у цэлым мала адрозніваецца: курс лекцый змяшчае больш энцыклапедычнага матэрыялу, чым кніга З. Шыбекі.

Не выпадкова, што праца З. Шыбекі ў нечым падобная на сінтэзы гісторыі Беларусі 20-х гадоў XX ст. Гэта відаць ужо па той увазе, якую аўтар звярнуў на дзейнасць Віленскага універсітэта і яго кіраўніцтва. На сёння гісторыя З. Шыбекі - чарговая сучасная абагульняючая праца, ў якой гэты універсітэт разглядаецца як неад'емная і паўнавартасная частка беларускай культуры. Упершыню ў сінтэзных працах па гісторыі Беларусі З. Шыбека вылучае і такі пункт, як . «Асветніцкая дзейнасць езуітаў» [26, с. 40 - 41], дзе распавядае пераважна пра Полацкую акадэмію.

У працы З. Шыбекі насуперак савецкай гістарыяграфіі адкрыта выказваецца прэтэнзія на прыналежнасць беларускай культуры канца XVIII - перашай паловы XIX стст. да заходнееўрапейскай, якая пранікала сюды пры пасрэдніцтве польскай мовы [26, с. 84]. У сваю чаргу, пры высвятленні ролі расійскай культуры на Беларусі аўтар адзначае: «расійскае грамадства не цікавілася Беларуссю» [26, с. 85]. Дасягненнямі мясцовых польскамоўных інтэлігентаў павінны, на думку аўтара, ганарыцца «у роўнай меры і палякі, і беларусы» [26, с. 85]. Цяжка не пагадзіцца са слушным адзначэннем З. Шыбекам тэтральнага мастацтва, жывапісу і музыкі як элементаў элітарнай культуры.

Менавіта ў 90-х гадах мінулага стагоддзя адбыўся рашучы адыход ад усталяванагл ў БССР погляду на беларускую культуру. Сведчаннем апошняга з'яўляецца праца Л. Лыча і У. Навіцкага «Гісторыя культуры Беларусі», першае выданне якой пабачыла свет у 1995 г., а другое, дапоўненае, - у 1997 г. [27],

дзе аўтары зрабілі шэраг каштоўных назіранняў адносна стану беларускай культуры ў першым пяцідзесяцігоддзі знаходжання ў складзе Расійскай імперыі. Агляд беларускай культуры разгорнуты даследчыкамі ў нетрадыцыйным для Беларусі культуралагічным рэчышчы: тут няма аналізу літаратурных твораў, жывапісу і г.д. Аўтары паспрабавалі даць адзнаку культурнай палітыкі царызму і высветліць у сувязі з гэтым культурна-гістарычныя адметнасці Беларусі.

Культура Беларусі канца XVIII - першай паловы XIX стст. падрабязна разглядаецца і ў двух выданнях (2001 і 2003 гг.) працы магілёўскага гісторыка С. Парашкова «Гісторыя культуры Беларусі» [28]. Адрозненне паміж манаграфіяй С. Парашкова і кнігай Л. Лыча і У. Навіцкага мае прынцыпова характар. Даследаванне С. Парашкова жорстка прывязана да храналагічных рамак і звычайных для гісторыі культуры сюжэтаў. Чацверты раздзел кнігі «Культура Беларусі ў першай палове XIX ст.» [28, с. 166 - 202] улічвае амаль усё лепшае, што было напрацавана беларускай навукай за 60 - 90-я гады XX ст.

2003 г. яшчэ раз засведчыў неардынарнасць беларускай гістарыяграфічнай сітуацыі дзякуючы з'яўленню «унікальнай» «Гісторыі Беларусі» *Я.* Трашчанка [29]. З часоў расійскіх імператараў не выходзіла такой блізкай па духу да вядомых «Лекцый па гісторыі Заходняй Расіі» Міхаіла Каяловіча версіі гістарычных лёсаў Беларусі. Але не агульная канцэпцыя выглядае самым супярэчлівым момантам у творы магілёўскага гісторыка. Студэнтам Я. Трашчанок прапаноўвае не аналіз падзей, а суцэльную плынь публіцыстычных выказванняў і палемічных разважанняў. Вучэбны дапаможнік Я. Трашчанка цяжка назваць кнігай, прыдатнай для вышэйшай школы, паколькі яе тэкставы аб'ём вельмі абмежаваны: без уводзінаў толькі 152 старонакі адведзена дасавецкаму перыяду. У главе, прысвечанай 1772 - 1863 гг., магілёўскі гісторык увогуле не вылучае параграфа пра культуру Беларусі. Разважанні аўтара пра станаўленне беларускай нацыі і культуры Беларусі XIX ст. былі вынесены ў асобны параграф наступнай главы. Такі спецыфічны падыход да сістэматызацыі матэрыялу па гісторыі культуры ў дапаможніку нічым не абгрунтаваны і ў абагульняючых працах прысутнічае ўпершыню. Але і вылучэнне параграфа пад асвятленне культурнага жыцця Беларусі ў цэлым за XIX ст. ніяк не выратоўвае сітуацыю: скласці нават самае наіўнае ўяўленне пра станаўленне беларускай культуры на аснове кнігі нельга прынцыпова. Трэба звярнуць увагу толькі на той красамоўны факт, што ніколі да з'яўлення кнігі Я. Трашчанка абагульняючыя працы не абыходзілі ўвагай творчасць В. Дуніна-Марцінкевіча. Уся літаратура, створаная да Коласа і Купалы, безапеляцыйна называецца «днлетантскнмн подражательнымн попыткамн творчества по-белорусскн» [29, с. 154]. Больш таго, магілёўскі гісторык не згадвае нават імёны навукоўцаў, якія займаліся вывучэннем беларускай гісторыі і культуры ў першай палове XIX ст. Ні слова ў кнізе няма пра жывапіс і тэатр, ні згадкі пра архітэктуру і скульптуру і г.д. Рэдактарская (аўтарская) праца таксама выклікае пытанні. Напрыклад, на с. 119 у дапаможніку фігурыруе «лнчный друг царя польскнй магнат князь Адам Чарторнжскнй», а ніжэй, на с. 144 мы маем справу ўжо з магнатам «А. Чарторысскнм», што ў абодвух выпадках памылкова. А між тым гэта выданне выйшла пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і Магілёўскага універсітэта і з'яўляецца дапаможнікам для вышэйшых навучальных установ.

У тым жа 2003 годзе выйшла яшчэ адна абагульняючая праца «Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі», якая таксама з'яўляецца дапаможнікам для студэнтаў вну [30]. Гісторыя культуры ў першай палове XIX ст. тут фактычна зведзена да двух аспектаў: адукацыі і навукі [30, с. 142 - 146].

Падагульняючы агляд прац па нашай праблеме, якія з'явіліся за апошняе дзесяцігоддзе можна адзначыць, што агульны ўзровень навуковых і вучэбных выданняў, за асобным выключэннем, дастаткова высокі. Аднак адчуваецца недахоп у арыгінальных даследаваннях і інтэрпрэтацыях. Беларускія гісторыкі вярнуліся да раней неактуальных тэм, адыйшлі ад адназначных ацэнак, але часам гэта проста адыход ад адных шаблонных характарыстык падзей і з'яў да іншых. Разам з тым новыя падыходы да асвятлення праблем культуры ў абагульняючых працах паўплывалі на напаўненне школьных падручнікаў, дзе культуры Беларусі першай паловы XIX ст. адведзена належнае месца [31].

Культурны працэс толькі на першы погляд з'яўляецца другасным фактарам гістарычнай эвалюцыі- Уплыў палітыкі і эканомікі на культуру быў заўсёды. Амаль заўсёды можна прасачыць і ўплыў палітыкі на стварэнне гісторыі культуры. У абагульняючых працах па гісторыі Беларусі можна вылучыць як шэраг нейтральных перыядаў развіцця культуры, калі зыходзіць з іх агульнай адзнакі, так І перыяды, адзнака якіх стала звязана з палітычнай арыентацыяй аўтараў даследаванняў. Да апошніх перыядаў у першую чаргу трэба аднесці час з канца XVIII ст. да сярэдзіны XIX ст.

У абагульняючых працах па гісторыі Беларусі можна вылучыць некалькіх этапаў у асвятленні культурных працэсаў на беларускіх землях у канцы XVIII - першай палове XIX стст.

У працах У. Ігнатоўскага і М. Доўнар-Запольскага вызначальным з'яўляецца разгляд культурных падзей у кантэксце палітыкі расійскага ўраду на Беларусі. Менавіта антыруская скіраванасць прац гэтых гісторыкаў стала прычынай іх доўгага забыцця. Для прац У. Ігнатоўскага і М. Доўнар-Запольскага **уласцівы і некаторыя тэмы, якія пазней не вылучаліся ці пісаліся іначай.**

Параўнанне першай (1954 г.) і апошняй (1972 г.) татальных версій гісторыі БССР сведчыць: па-першае, пра адыход ад вульгарна-марксісцкага падыходу да з'яў культуры; па-другое, пра павелічэнне апектаў культуры, якія разглядаюцца ў аналізуемых выданнях.

Беларуская гістарыяграфія 90-х гадоў XX ст. здолела пайсці значна наперад дзякуючы пераасэнсаванню спадчыны гісторыкаў перыяду беларусізацыі і назапашанага савецкай гістарычнай навукай. На нашу думку, лепшай за апошнія гады спробай інтэрпрэтацыі гісторыі Беларусі першай паловы XIX ст. і культуры гэтага часу ўключна з'яўляецца праца 3. Шыбекі.

ЛІТАРАТУРА


1. Турчпновпч О. Обозренне псторнп Белорусснн с древнейшнх времён. - СПб., 1857.
2. Жпвопнсная Росспя: Отечество наше в его зем., нст., плем., экон., н быт. значеннп: Лнтов. п Белорус. Полесье: репрннт. Воспропзведенне пзд. 1882 г. - Мн.: БелЭн, 1993. - 550 с.
3. Ластоўскі В.Ю. Кароткая гісторыя Беларусі. - Вільня, 1910; Мн.: Універсітэцкае, 1992. - 126 с.
4. Ігнатоўскі У.М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. - Мн.: Беларусь, 1991. - 190 с.
5. Ігнатоўскі У. Гісторыя Беларусі ў XIX і ў пачатку XX сталецця. - Мн.: Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, 1928.-253 с.
6. Доўнар-Запольскі М.В. Гісторыя Беларусі. - Мн.: БелЭн, 1994. - 510 с.
7. Найдзюк Я., Касяк І. Беларусь учора і сяння: Папулярны нарыс з гісторыі Беларусі. - Мн.: Навука і тэхніка, 1993. -414 с.
8. Ліндэр Р. Гісторыкі і ўлада: нацыятворчы працэс і гістарычная палітыка ў Беларусі XIX - XX стст. - СПб., Неўскі прасцяг. - 2003. - 327 с.
9. Нсторпя Белорусской ССР. Т. 1. - Мн.: Нзд-во АН БССР, 1954. - 504 с.
10. Нсторпя Белорусской ССР. Т. 1. - Мн.: Нзд-во АН БССР, 1961.-521 с.
11. Кароткі начырк гісторыі Крывіч-Беларусі // Станкевіч Я. Гістарычныя творы. - Мн.: Энцыклапедыкс, 2003.-С. 185 - 186.
12. Гісторыя Беларускай ССР. Т. 1. - Мн.: Навука і тэхніка, 1972. - 634 с.
13. Нсторпя Белорусской ССР. - Мн.: Наука н технпка, 1977. - 632 с.
14. Коятап М. Нізіогіа Віаіогцзі. - ХУгосІамс Хакіаб іт. ОззоІіпккісЬ, 1979. - 406 5.
15. Нсторня БССР. Ч. 1. - Мн.: Нзд-во БГУ, 1981,- 328 с.
16. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2-х ч. Ч. 1. - Мн.: Беларусь, 1994. - 527 с.
17. Гісторыя Беларусі. - Мн.: Экаперспектыва, 1996. - 496 с.
18. Гісторыя Беларусі: Дапаможнік для паступаючых у вну. - Мн.: Экаперспектыва, 1998. - 496 с.
19. Гісторыя Беларусі: У 2 ч. Ч. 1. Ад старажытнасці - па люты 1917 г. - Мн,:Універсітэцкае,1998.- 416 с.
20. Ковкель П.Н., Ярмуснк Э.С. Нсторпя Беларусн с древнейшпх времён донашеговременн. -Мн.: Аверсэв, 1998. - 592 с.
21. Чнгрпнов П.Г. Очеркн псторнн Беларусп: Учеб. пособне для вузов. - Мн.: Выш. шк., 2000. - 461 с.
22. Улавднк Н.Н. Очеркн по археографпп п псточннковеденпю псторпн Белорусснн феодального перпода. - М.: Наука, 1973. - С. 44.
23. Гісторыя Беларусі: з 1795 г. да вясны 1917.: Вучэбны дапаможнік. - Мн.: Аверсэрв, 2001. - 400 с.
24. Гісторыя Беларусі: дапаможнік для паступаючых у вну. - Мн.: Экаперспектыва, 1998. - С. 213 - 214.
25. Гісторыя Беларусі: У 2 ч.: Курс лекцый. - Мн.: РІВШ БДУ, 2000. Ч. 1: Са старажытных часоў да канца XVIII ст. - 656 с.; Гісгорыя Беларусі: У 2 ч.: Курс лекцый. - Мн.: РІВШ БДУ, 2002. Ч. 2: XIX - XX ст. - 654 с.
26. БгуЬіека 2. Нізіогіа Віаіошзі: 1795-2000. - ІвдЫіп: ІпзІуШІ Евдору Бгобком'о-ЛзсЬосІпіе), 2002. - 572 з. Беларускае выданне гэтай кнігі здзейснена ў канцы 2003 г.: Шыбека 3. Нарыс гісторыі Беларусі (1795 - 2002). - Мн.: Энцыклапедыкс, 2003. - 490 с.
27. Лыч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі. - 2-е выд., дап. - Мн.: Экаперспектыва, 1997. - 486 с.
28. Парашкоў С.А. Гісторыя культуры Беларусі: Вучэбны дапаможнік. - Магілёў: МДУ імя А. Куляшова, 2001. - 296 с.; Парашкоў С.А. Гісторыя культуры Беларусі. - Мн: Бел. навука, 2003. - 444 с.
29. Тревденок Я.П. Псторня Беларусн: Учеб. пособне. - Могплёв: МГУ нм. А.А. Кулешова, 2003. Ч. 1: Досоветскнй пернод. - 176 с.
30. Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі: Дапаможнік / У.Р. Казлякоў, С.В. Марозава, У.А. Сосна і інш.; Пад рэд. Л.В. Лойкі. - Мн.: ТАА «ЦІПР», 2003. - 348 с.
31. Гісторыя Беларусі: Канец XVIII ст. - 1996 г.: Вучэб. дапам. для вучняў 11-га кл.: У 2 кн. Кн. 1. - Мн.: Нар. асвета, 1996. - 142 с.; Гісторыя Беларусі: Канец XVIII ст. - 1999 г.: Вучэб. дапам. - Мн.: Нар. асвета, 2000. - 206 с.